31 мая 2018 года, № 8 (1212)

# МЫ НА ФЕСТЫВАЛІ ВЫДАТНА ПРАЦАВАЛІ

«Удасканальвай сябе!» – пад такім дэвізам прайшло адкрыццё III Міжнароднага фестывалю псіхалагічнага майстэрства, які арганізаваў Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ пры ўдзеле Інстытута псіхалогіі. Мерапрыемства адбылося 18–19 мая на базе Беларуска-Італьянскага адукацыйнага цэнтра. Сёлета да яго далучыліся прадстаўнікі не толькі Беларусі і Італіі, але і Літвы, Расіі, Украіны і Эстоніі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ва ўрачыстым адкрыцці псіхалагічнага форуму прынялі ўдзел прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ А. В. Макоўчык, дырэктар ІПКіП І. У. Шасцітка, Ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у Кальяры (Сардзінія) Джузэпэ Карбоні.

У рамках фестывалю з лекцыямі і майстар-класамі выступілі вядучыя беларускія і замежныя спецыялісты па кагнітыўнай псіхалогіі, псіхасінтэзе, транзактным аналізе, эрыксанаўскім гіпнозе; у галіне псіхалогіі адносін, канфлікталогіі, эмацыйна-вобразнай, крызіснай, кагнітыўнай, сямейнай тэрапіі, гештальті казкатэрапіі.

Фестываль меў ярка акрэслены практычны фармат. Так, на майстар-класе Яўгена Вялічкіна (г. Масква) «Рашэнне псіхасаматычных праблем з дапамогай эмацыйна-вобразнай тэрапіі ў комплексе з транзактным аналізам і псіхасінтэзам» былі прадстаўлены эфектыўныя і даступныя тэхнікі работы ў сферы псіхасаматыкі праз вобразы. Наведаўшы майстар-клас Алены Грыбанавай (г. Магілёў) «Суіцыдальныя паводзіны. Асаблівасці правядзення перамоў пры спробе суіцыду», удзельнікі змаглі пазнаёміцца з адным з самых актуальных кірункаў крызіснай работы псіхолага. На майстар-класе Наталлі Аліфіровіч (г. Мінск) «Эмацыйна-факусаваная тэрапія (ЭФТ) у працы з сямейнымі парамі», прысутныя мелі магчымасць ацаніць выключную важнасць эмацыйных працэсаў у арганізацыі ўзаемадзеяння.

Пазнаёміцца з прынцыпамі дзеяння эрыксанаўскага гіпнозу, які выкарыстоўвае здольнасць чалавека да міжвольнага гіпнатычнага трансу (стан псіхікі, у якім яна найбольш адкрытая і гатовая да пазітыўных змен. – Рэд.), даведацца аб магчымасцях яго прымянення на практыцы ўдзельнікі фестывалю змаглі на майстар-класе Дзяніса Северава (г. Мінск).



Ці існуюць ідэальныя сем'і? Якія асноўныя «інгрэдыенты» шчаслівага шлюбу? Некаторыя сакрэты гэтай тэмы раскрылі Ірына Жураўкіна і Таццяна Кяцко (г. Мінск), якія правялі майстар-клас «Ідэальная сям'я: міф і рэальнасць».

Другі дзень фестывалю быў адкрыты лекцыяй «Кагнітыўнае старэнне: нейрапсіхалогія і змяненне інтэлекту» прафесара Універсітэта г. Кальяры Рыты Петрэта Данатэла (Італьянская Рэспубліка), якая і ў мінулым годзе дзялілася з удзельнікамі форуму сваім вопытам. Сёлета італьянская даследчыца з задавальненнем пагадзілася прыехаць у Мінск у складзе дэлегацыі Сардзініі. Тэарэтычную частку выступлення сваёй калегі працягнуў Лука Гавіяна майстаркласам «Кагнітыўнае старэнне: псіхалагічны аналіз ад слабых кагнітыўных парушэнняў да дэменцыі». У другой палове дня адбылася інтэрактыўная лекцыя дырэктара Цэнтра лячэння і рэабілітацыі нарказалежных, магістра сацыяльных навук Рыты Кердман, а таксама загадчыка аддзялення гэтай жа ўстановы доктара філасофіі і псіхалагічных навук Ганны Джалалавай (Эстонія). Закранутая тэма была працягнута падчас майстар-класа Максіма Пылёва (г. Мінск) «Праца з залежнымі формамі паводзінаў».

Вольга Пянкрат пазнаёміла ўдзельнікаў з тонкасцямі «Розен-метаду» – аднаго з прыёмаў цялесна-арыентаванай псіхатэрапіі, дзе спалучаюцца вербальны кантакт і праца з хранічна напружанымі мышцамі цела.

*Фестываль скончыўся абменам думкамі і ўражаннямі, пажаданнямі далейшага росквіту і рэалізацыі творчых ідэй, урачыстым уручэннем падзяк майстрам і сертыфікатаў удзельнікам.*

Юлія КАЛЯГА, кіраўнік Беларуска-Італьянскага адукацыйнага цэнтра БДПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ